Вучоныя запіскі 2010 • Вып. 6
Ч. 1. • Гуманітарныя і грамадскія навукі

УДК 070(091):947.6

*В.У. Коваль*

# УЗАЕМАСУВЯЗІ БЕЛАРУСКІХ І ЎКРАІНСКІХ СТУДЭНЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ЧЭХАСЛАВАКІІ (1918–1939)

Артыкул прадстаўляе аналіз месца і ролі беларускіх і ўкраінскіх студэнцкіх арганізацый паміж сусветнымі войнамі. Прадметам дадзенага даследавання з'яўляюцца палітычныя і культурныя сувязі паміж беларускімі і ўкраінскімі студэнтамі ў Чэхаславакіі. Тэма беларускай эміграцыі ў міжваенны перыяд слаба распрацаваная, але на сучасны момант актуальная і запатрабаваная. У артыкуле зроблена выснова аб тым, што найбольш актыўнымі палітычныя, культурныя і адукацыйныя кантакты паміж беларусамі і ўкраінцамі ў Чэхаславакіі былі з 1918 г. па 1939 г. Аўтар выкарыстаў новыя публікацыі беларускіх даследчыкаў і малавядомыя ў Беларусі матэрыялы замежных архіваў.

## Уводзіны

Тэма гісторыі беларускай дыяспары на сучасны момант становіцца ўсё больш і больш папулярнай, аднак з'яўляецца слаба распрацаванай беларускімі гісторыкамі. Адным з найбольш цікавых аспектаў дадзенай тэматыкі можна лічыць палітычныя, эканамічныя і культурныя кантакты з прадстаўнікамі іншых дыяспар, і найперш беларуска-ўкраінскія узаемасувязям эмігрантаў.

Міжваенная Чэхаславакія была краінай, дзе беларуская і ўкраінская моладзь магла атрымаць вышэйшую адукацыю, таму туды ехалі самыя ініцыятыўныя і дынамічныя асобы ў асноўным з тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Спрыяла развіццю студэнцкіх арганізацый у Чэхаславакіі гэтак званая "руская акцыя". Урад першага прэзідэнта Чэхаславацкай Рэспублікі Томаша Г. Масарыка аказваў сур'ёзную падтрымку эмігрантам з былой Расійскай імперыі, ствараючы спецыяльныя адукацыйныя праграмы для студэнтаў, у тым ліку для ўкраінскай і беларускай моладзі.

Да пытання гісторыі беларускага-ўкраінскага студэнцкага супрацоўніцтва ў Чэхаславакіі звярталіся як беларускія, так і ўкраінскія навукоўцы, але гэта не стала асноўнай тэмай іх даследаванняў (У. Ляхоўскі, А. Мастыка, В. Зубко, А. Пяленская) [12, 13, 10, 17]. Важнымі дакументамі ў асвятленні ўзаемакантактаў паміж эмігрантамі з'яўляецца дакументацыя ўкраінскіх і беларускіх студэнцкіх арганізацый, якая захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (г. Мінск) [1–7] і Цэнтральным дзяржаўным архіве вышэйшых органаў улады і кіравання (г. Кіеў) [25–31].

## Фарміраванне палітычнага цэнтра беларускай і ўкраінскай эміграцыі ў Чэхаславакіі

Буйнейшым палітычным і культурным цэнтрам на Захадзе для беларускай дыяспары ў міжваенны час стала Чэхаславакія, хаця колькасць беларусаў-эмігрантаў там у параўнанні з іншымі краінамі свету была невысокай. Дакладнай статыстыкі няма, магчыма выказаць меркаванне, што ў міжваеннай Чэхаславакіі жыло 500–700 беларусаў. Самі беларускія эмігранты называлі меншую лічбу, але іх падлік таксама мае прыблізны характар. Паводле звестак беларускага нацыянальнага дзеяча Тамаша Грыба, у агульнай масе студэнтаў з абшараў былой Расійскай імперыі ўраджэнцы Беларусі складалі каля 300 чалавек [12, с. 21]. Недакладнасць лічбы беларускай моладзі ў міжваеннай Чэхаславакіі перш-наперш звязана з нелегальным перасячэннем мяжы асобамі з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Беларускі эмігрант

В. Жук-Грышкевіч, які сам набываў адукацыю ў міжваеннай Празе, у сваіх успамінах падкрэсліваў: “Справа адукацыі беларускай моладзі ў Заходняй Беларусі камплікавалася тым больш, што польскія ўлады не давалі пашпартоў тым беларусам, што хацелі выехаць на навуку за граніцу. Але гэта ня стрымлівала нашых студэнтаў ад выезду ў Прагу. Яны ехалі нелягальна – “празь зялёную граніцу”, хоць і ведалі, што за гэта іх пазбавяць польскага грамадзянства” [9, с. 42]. Украінскія юнакі і дзяўчаты з тэрыторыі Заходняй Украіны былі ў тым жа становішчы, таму таксама былі вымушаны нелегальна ехаць у Чэхаславакію.

У міжваеннай Чэхаславакіі беларускіх вышэйшых навучальных устаноў не было, хаця сярод прадстаўнікоў палітычнай эміграцыі ўзнікала ідэя арганізацыі ўніверсітэта. Некаторыя беларускія студэнты вучыліся ў чэшскіх вышэйшых навучальных установах, у прыватнасці Карлавым універсітэце. Частка моладзі набывала адукацыю ва ўкраінскіх і рускіх універсітэтах, акадэміях і інстытутах у Чэхаславакіі.

Пры даследаванні кантактаў беларусаў і ўкраінцаў у Чэхаславакіі неабходна ўспомніць пра ўкраінскія навучальныя ўстановы, маладзёжныя аб’яднанні і гурткі, у якіх вучыліся і прымалі актыўны ўдзел беларускія эмігранты. Студэнты-беларусы набывалі адукацыю ва Украінскім вышэйшым педагагічным інстытуце імя М. Драгаманава (дзе ўпершыню была адкрыт кафедра беларусазнаўства ў 1923 г.), Украінскай гаспадарчай акадэміі, Украінскім тэхніка-гаспадарчым інстытуце і Украінскім сацыялагічным інстытуце, бралі ўдзел ва “Украінскім гісторыка-філалагічным таварыстве” і рабоце “Украінскай хаты” [10, с. 73]. Акрамя вышэйшых навучальных устаноў украінскіх эмігрантаў, з 1925 г. у Чэхаславакіі дзейнічала ўкраінская гімназія [21, с. 32], дзе заняткі вяліся на ўкраінскай мове. Беларускія юнакі і дзяўчаты прымалі ўдзел у мерапрыемствах Украінскай студыі пластычнага мастацтва, Украінскага таварыства кнігалюбаў, Музея вызвольнай барацьбы Украіны [17, с. 15]. Украінскія эмігранты станоўча ставіліся да паступлення беларускіх юнакоў і дзяўчат ва ўкраінскія навучальныя ўстановы і ўдзелу беларускай моладзі ў разнастайных мерапрымствах украінцаў замежжа.

**Асаблівасці супрацоўніцтва беларускіх і ўкраінскіх студэнцкіх арганізацый**

Пра дапамогу беларускім студэнтам ад украінскай дыяспары неаднаразова пісалі самі беларускія эмігранты. Напрыклад, у першым нумары часопіса “Перавясла” была апублікавана цікавая для даследавання гісторыі беларускага студэнцтва ў Чэхаславакіі статыстыка. У артыкуле “З беларускага студэнскага жыцьця ў Празе” пазначалася, што ў Аб’яднанне беларускага паступовага студэнцтва ўваходзіла ўсяго 110 чалавек (на 1923 г.), з якіх 100 вучылася ў Празе, 5 – у Падэбрадах ва Украінскай гаспадарчай акадэміі, 3 былі студэнтамі Украінскага педагагічнага інстытута імя М. Драгаманава і 10 вучыліся на падрыхтоўчых курсах пры інстытуце. Дадзеная статыстыка цудоўна характарызуе важнае значэнне ўкраінскіх вышэйшых навучальных устаноў для беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі. У артыкуле падкрэслівалася: “Усе ўспамянёныя студэнты знаходзяцца на ўтрыманьні Чэска-ўкраінскага камітэту для дапамогі беларускім і ўкраінскім студэнтам” [18, с. 63]. З матэрыялу вынікае, што значная частка студэнтаў-беларусаў у Чэхаславакіі атрымлівала стыпендыю ад Чэшска-ўкраінскага камітэта дапамогі ўкраінскім і беларускім студэнтам.

Сапраўды, для гісторыі развіцця беларуска-ўкраінскіх сувязей у Чэхаславакіі важную ролю меў Чэшска-ўкраінскі камітэт дапамогі ўкраінскім і беларускім

студэнтам у Празе. Арганізацыя была створана эмігрантамі ў 1921 г. і актыўна працавала да 1929 г. У працэсе заснавання камітэта ўдзельнічалі такія вядомыя ўкраінскія палітычныя дзеячы і выкладчыкі, як Шапавал, Бідла, Калесо, Грыгор'еў, Смаль-Стоцкі, Чэрняўскі [28, л. 1]. Асноўныя задачы камітэта былі дакладна акрэслены ў Статуце арганізацыі: "Задачы Камітэта: аказваць матэрыяльную і маральную дапамогу студэнтам Украінцам і Беларусам" [27, л. 15]. Чэшска-ўкраінскі камітэт дапамогі ўкраінскім і беларускім студэнтам на працягу 1920-х гадоў са сваёй асноўнай задачай паспяхова спраўляўся. Члены камітэта старанна адсочвалі паспяховасць навучання беларускіх і ўкраінскіх студэнтаў, матэрыяльна падтрымлівалі выдатнікаў і не выдавалі стыпендый юнакам і дзяўчатам, якія мелі запазычанасці. Усе свае адзнакі неабходна было абавязкова дакументальна пацвердзіць, у камітэце існавала спецыяльная праверачная камісія [29, л. 58], якая ўдакладняла звесткі пра паспяховасць навучання студэнтаў.

У Статуце камітэта быў дакладна прапісаны склад арганізацыі. Штогод Чэшска-ўкраінскі камітэт дапамогі ўкраінскім і беларускім студэнтам выбіраўся ў наступных суадносінах: чэшскіх прафесараў і студэнтаў, 4 прафесары ўкраінскага ўніверсітэта, 4 прадстаўнікі ўкраінскага студэнцтва, 8 прадстаўнікоў Украінскага грамадскага камітэта, 2 прадстаўнікі беларусаў (1 ад беларускага грамадства, 1 ад беларускага студэнцтва) [27, л. 15]. Колькасць беларускіх прадстаўнікоў у камітэце значна саступала колькасці ўкраінцаў, што тлумачыцца суадносінамі беларускіх і ўкраінскіх студэнтаў, якім аказвалася дапамога. Большасць студэнтаў, якія жылі ў Чэхаславакіі пры падтрымцы Чэшска-ўкраінскага камітэта, былі ўкраінцамі. Разам з тым на грошы арганізацыі вучыліся і беларусы: М. Садоўская [29, л. 5], В. Ермачэнка [29, л. 58], Я. Ермачэнка [29, л. 72], І. Войцман [31, л. 57], П. Антановіч [25, л. 13] і інш. Неабходна падкрэсліць, што Чэшска-ўкраінскі камітэт дапамогі аплачваў навучанне не толькі тым беларусам, якія вучыліся ва ўкраінскіх вышэйшых навучальных установах, але і тым, хто атрымоўваў асвету ва універсітэтах Чэхаславакіі, напрыклад Карулавым універсітэце ці Чэшскай вышэйшай тэхнічнай школе.

Да беларускіх студэнтаў былі абсалютна такія ж патрабаванні, як і да ўкраінскай моладзі. Узровень паспяховасці беларусаў у Чэхаславакіі, як і ўкраінцаў, быў розны. Напрыклад, студэнтка медыцынскага факультэта беларуска Марыя Садоўская вучылася добра, а беларуская студэнтка Вера Ермачэнка сістэматычна мела запазычанасці і не магла дакументальна пацвердзіць здачу сваіх экзаменаў. Камітэт уважліва адсочваў адзнакі ўсіх студэнтаў, высвятляліся абставіны пропускаў заняткаў і экзаменаў, збіраліся звесткі пра наведванне лекцый.

Асноўным кірункам падтрымкі ўкраінскіх і беларускіх студэнтаў у Чэхаславакіі стаў матэрыяльны. Пры ўмове выдатных адзнак, можна было атрымліваць кожны семестр пэўную суму ў чэшскіх кронах, якой хапіла б для аплаты пражывання ў Чэхаславакіі. Акрамя таго, камітэтам была арганізавана выдача прадуктаў студэнтам, пра што сведчыць спецыяльная кніга выдачы харчавання [30]. Такім чынам, уся дзейнасць Камітэта ў кантэксце "рускай акцыі" была накіравана на матэрыяльную і маральную дапамогу беларускаму і ўкраінскаму студэнцтву з мэтай фарміравання інтэлігенцыі ў эміграцыйным асяродку.

Беларускае студэнцтва ў Чэхаславакіі аб'ядноўвалася ў грамадскія арганізацыі па нацыянальнай прыкмеце па прыкладзе іншых дыяспар. Напрыклад, у 1922 г. Янка Станкевіч заснаваў Беларускую студэнцкую арганізацыю ў Празе. Друкаваным органам арганізацыі стаў часопіс "Беларускі студэнт". У склад рэдкалегіі і актыву аўтараў

уваходзілі Я. Станкевіч, Я. Ермачэнка, Х. Хлаўскі, Брачыслаў Скарыніч (псеўданім), В. Грывіч (псеўданім Вінцэнта Грышкевіча) і іншыя [24, с. 10]. "Беларускі студэнт" праіснаваў толькі адзін год, за які выйшла з друку 7 нумароў часопіса. Самым актыўным аўтарам выдання быў сам Я. Станкевіч. На старонках "Беларускага студэнта" ён не раз падкрэсліваў, што беларусам неабходна выкарыстоўваць вопыт сусветных культур. Важную ролю Я. Станкевіч адводзіў украінскай культуры, якая, на яго погляд, характарызавалася свабодным духам і ідэямі адраджэння [24, с. 12]. Магчыма, асаблівая ўвага аўтара да ўкраінскай дыяспары тлумачыцца тым фактам, што сам Я. Станкевіч вучыўся ва Украінскім вышэйшым педагагічным інстытуце імя М. Драгаманава [19, с. 31]. Ён меў шырокае кола знаёмых з ліку прадстаўнікоў украінскай эміграцыі.

Беларуская студэнцкая арганізацыя цесна супрацоўнічала са студэнцтвам украінскай дыяспары. Садзейнічалі гэтаму падобныя палітычныя перакананні эмігрантаў. Беларускую і ўкраінскую моладзь часта аб'ядноўвала вострая крытыка польскіх уладаў, арганізацыя ў Чэхаславакіі мітынгаў і дэманстрацый. У перыядычных выданнях беларускія эмігранты публікавалі артыкулы не толькі пра агульныя з украінцамі мерапрыемствы, але і палітычныя матэрыялы ўкраінскіх эмігрантаў. Напрыклад, у апошнім нумары "Беларускага студэнта" выйшаў з друку артыкул маладога прадстаўніка ўкраінскай дыяспары М. Туган-Бараноўскага [24, с. 12]. Апошні нумар часопіса наогул асабліва агрэсіўна крытыкаваў Польшчу і Савецкую дзяржаву.

Прынцыповым пытаннем для беларускага студэнцтва было выйсці на міжнародны ўзровень. Адной з самых папулярных у міжваенны час была міжнародная студэнцкая арганізацыя C.I.E. (Confédération Internationale des Étudiants – Міжнародная студэнцкая канфедэрацыя). З трыбуны міжнароднай арганізацыі беларуская моладзь хацела заявіць пра дыскрымінацыю палякамі беларускай нацыянальнай меншасці, распавесці пра становішча беларускіх школ, узняць пытанне аб беларускай эміграцыі.

Артыкул з асабістага фонда эмігранта В.М. Русака Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь яскрава сведчыць, што беларускім студэнтам вельмі важна было ўвайсці ў шэрагі C.I.E. У рукапісе "Студэнцтва і ягоныя арганізацыі" аўтар падрабязна апісвае ролю для міжнароднай арганізацыі C.I.E. беларускай дыяспары. [14, л. 1–6]. Ён падкрэслівае важнасць дзейнасці Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый, створанага ў 1924 г., для ўваходжання беларускай моладзі ў міжнародную канфедэрацыю, для ўсёй беларускай эміграцыі. "Як вынік перагавораў між паасобнымі беларускімі студэнскімі арганізацыямі (Praha, Vilna, Rym, Padebrady, Bratislava, Brno) была створана ў 1924 г. свая ўласная цэнтраля АБСА з тымчасовай сядзібаю ў Празе, якая зараз-жа па зарганізаванню пачала супрацоўнічаць з чужаземным студэнствам" [14, л. 2], – пісаў В. Русак.

C.I.E. была заснаваная ў 1919 г. у Страсбургу студэнтамі вядучых еўрапейскіх краін [13, с. 13]. Афіцыйна Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый стала членам Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі з 1926 г. [14, л. 3], але актыўнае супрацоўніцтва і ліставанне пачалося на некалькі гадоў раней, ужо з 1924 г., пра што сведчыць сшытак рэгістрацыі ўваходных і выходных дакументаў АБСА [6, л. 6 адв.– 7 адв.]. Міжнародная студэнцкая канфедэрацыя сістэматычна рассылала свае бюлетэні, часопіс C.I.E., запрашэнні на кангрэс канфедэрацыі, афіцыйныя лісты, паведамленні аб смерці дзеячаў і г. д. Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый стала найбольш папулярнай студэнцкай арганізацыяй у асяродку беларускіх эмігрантаў. Сваіх афіцыйных прадстаўнікоў АБСА пасылала на кангрэсы C.I.E. за кошт арганізацыі, што сведчыць пра важнасць іх удзелу ў рабоце Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі. Беларускім

студэнтам неабходна было заявіць на сусветнай арэне пра сваю палітычную і культурную дзейнасць, таму, нягледзячы на невялікі бюджэт аб'яднання,было вылучана па 1000 чэшскіх крон на прадстаўніка АБСА для ўдзелу ў кангрэсе [5, л. 11]. Аб'яднанне мела сваіх прадстаўнікоў у буйнейшых краінах свету, дзе атрымлівалі адукацыю беларусы, супрацоўнічала з іншымі сусветнымі студэнцкімі беларускімі арганізацыямі ў Рыме, Нью-Ёрку, Браціславе і г. д.

Украінскае студэнцтва было раней прынята ў С.І.Е., а менавіта ў 1922 г., дзе яго ў якасці вольнага члена прадстаўляў Цэнтральны саюз украінскага студэнцтва (ЦЭСУС) да 1938 г. [8, с. 73]. Саюз аб'ядноўваў найбольш значныя і пашыраныя за мяжой студэнцкія арганізацыі. У яго склад уваходзілі аб'яднанні ўкраінскай моладзі Заходняй Украіны, Букавіны, украінцы-эмігранты. Сярод арганізацый ЦЭСУС варта адзначыць наступныя: таварыства "Січ" у Вене, Украінская студэнцкая суполка ў Балгарыі, суполка ўкраінскага студэнцтва ў Берліне, таварыства "Молат", Акадэмічная грамада студэнтаў-украінцаў у Германіі, Украінская краёвая студэнцкая рада ў Львове, Камітэт украінскіх студэнтаў Букавіны, Таварыства ўкраінскай моладзі ў Нью-Ёрку, Суполка ўкраінскіх студэнтаў у Заграбе, Саюз украінскага студэнцтва на эміграцыі ў Польшчы, Саюз украінскіх студэнтаў у Германіі, таварыства "Заря" ў Бухарэсце, Студэнцкая грамада ў Люблянах, Студэнцкая грамада ў Егіпце, Сацыялістычны студэнцкі саюз і Ліга ўкраінскіх студэнтаў у Львове, Украінская студэнцкая суполка ў Турцыі, Саюз украінскіх студэнтаў "Аснова" ў Данцынгу [26, л. 1–3]. У ЦЭСУС уваходзілі розныя палітычныя кірункі, што не перашкаджала саюзу весці актыўную міжнародную працу. Колькасць членаў ЦЭСУС паступова павялічвалася. Калі ў 1922 г. у саюзе дзейнічала 15 арганізацый, то напрыканцы 1920-х гадоў – 32 украінскія студэнцкія арганізацыі [8, с. 73], што сведчыць пра яго папулярнасць у асяродку ўкраінскай моладзі. Дзейнасць ЦЭСУС падтрымлівалася фактычна ўсёй украінскай дыяспарай свету. Саюзу адразу з 1922 г. пачалі перарахоўваць грошы ўкраінскія эмігранты для развіцця арганізацыі [20, с. 15], асабліва значнай была фінансавая падтрымка ўкраінскай дыяспарай ЗША і Канады.

З 1922 г. па 1926 г. у рамках дзейнасці Міжнароднай студэнцкай арганізацыі ўкраінскія студэнты ад ЦЭСУС абаранялі не толькі свае інтарэсы, але і беларускага студэнцтва, выступалі на канферэнцыях з беларускімі рэфератамі [1, л. 22], інфармавалі грамадства пра дзейнасць беларусаў у свеце. Пра важнасць кантактаў з украінцамі пісалі беларускія студэнты ў сваёй справаздачы канферэнцыі С.І.Е. [4, л. 5], якая праходзіла ў Празе з 18 па 29 жніўня 1926 г. У рамках праграмы мерапрыемства разглядалася не толькі пытанне прыняцця беларусаў у вольныя сябры арганізацыі, але і роля падтрымкі ўкраінскага студэнцтва за мяжой.

Прадстаўнікі ўкраінскай арганізацыі аказалі падтрымку беларусам падчас прыняцця членам ў беларускага аб'яднання С.І.Е., пра што неаднаразова сведчылі лісты Уладзіміра Жылкі за 1924 г. У верасні 1924 г. на VII кангрэсе Міжнароднай канфедэрацыі студэнтаў, які праходзіў у Варшаве, беларускую дэлегацыю ўзначальваў У. Жылка [12, с. 33]. "Масюкевіч прыслаў учора з Львова тэлеграму, што сёння (панядзелак) прыедзе ў Кракаў з ліку дзесяці чалавек і спадзяецца, што Лоскі, Арлэцькі ўжо тут. Не, апошніх дагэтуль няма. Няма і Масюкевіча. Між іншым ё пражаньне ад укр. студ. грамады" [2, л. 14], – пісаў У. Жылка. Для падтрымкі на міжнародным узроўні Жылка нездарма чакаў украінскую дэлегацыю, бо гэта былі яго сябры і саюзнікі. "Зараз даведаўся, што ўкраінская дэлегацыя прыедзе заўтра ў 10 гадзін раніцы", – пазначаў у тым жа лісце аўтар. Украінскі палітычны дзеяч Масюкевіч, пра якога згадваецца ў лісце,

уваходзіў у кіраўніцтва ЦЭСУС [7, л. 18 дв.], меў сяброўскія адносіны з Жылкалі і сапраўды падтрымліваў беларускіх студэнтаў.

На старонках прэсы беларускай эміграцыі часам друкаваліся матэрыялы пра агульныя для беларусаў і ўкраінцаў праблемы ў студэнцкім асяродку за мяжой. Прыкладам можа быць артыкул "З студэнскага жыцьця", апублікаваны ў часопісе "Рэха". У матэрыяле распавядаецца, што беларусаў і ўкраінцаў спачатку прынялі ў Міжнародную студэнцкую арганізацыю, а пасля выключылі з яе па ініцыятыве палякаў. Аўтар артыкула падпісаўся псеўданімам "Студэнт", ён падрабязна тлумачыць чытачам: "Беларуская-ж і ўкраінская студэнства з акупаваных зямель Польшчай і іншых беларускіх студэнскіх асяродкаў, раськіданых па розных унівэрсітэтах Еўропы, глядзела на С.І.Е. з другога боку. Ім хадзіла, галоўным чынам, знаёміць студэнства сьвету з беларускім вызвольным рухам" [22, с. 18]. У артыкуле падкрэсліваецца, што беларускія і ўкраінскія студэнты атрымалі падтрымку ў Міжнароднай студэнцкай арганізацыі з боку балгараў, сербаў, немцаў, англічан, амерыканцаў, а выключэнне з арганізацыі з'яўляецца несправядлівым. Беларускую і ўкраінскую студэнцкія арганізацыі (у асноўным з ліку жыхароў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны) выключылі з ліку членаў С.І.Е. па прапанове польскіх студэнтаў у 1938 г., што выклікала абурэнне як беларусаў, так і ўкраінцаў замежжа.

Кантакты прадстаўнікоў беларускага і ўкраінскага студэнцтва за мяжой таксама можна прасачыць у рамках дзейнасці Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні, пра што сведчыць багатае ліставанне. Карэспандэнцыя саюза захоўваецца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь [15]. Беларускі студэнцкі саюз (БСС) быў заснаваны 1 снежня 1920 г. [13, с. 7] на базе ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя ў Вільні. Асабліва актыўным было ліставанне БСС з Аб'яднаннем беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА) у Празе. Вясной 1927 г. БСС далучыўся да АБСА ў Празе [13, с. 13], пасля чаго пачалося шчыльнае супрацоўніцтва беларускіх студэнтаў Вільні і замежжа. Таксама Беларускі студэнцкі саюз падтрымліваў цесныя кантакты з арганізацыямі ўкраінскіх студэнтаў у Вільні, Львове, Варшаве. Асаблівую цікавасць прадстаўляюць лісты ад прадстаўнікоў украінскай дыяспары, навіны і інфармацыя пра дзейнасць якіх пасля рассылалася беларускай моладзі па ўсім свеце.

Ліставанне Беларускага студэнцкага саюза яскрава характарызуе сяброўскія адносіны паміж беларускім і ўкраінскім студэнцтвам. Украінскія студэнцкія арганізацыі сістэматычна віншавалі членаў БСС з юбілеямі, гадавінамі і святамі [15, л. 38], намагаліся не губляць сувязі, інфармаваць пра свае навіны. Свой ліст да Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні у 1923 г. даслаў Цэнтральны саюз украінскага студэнцтва, які дзейнічаў у Празе. Украінцы ў лісце падкрэслівалі, што дзеля ўмацавання ўзаемасувязей паміж беларускім і ўкраінскім студэнцтвам яны будуць сістэматычна інфармаваць беларусаў пра свае падзеі: "Паведамляем Вам, што Цэнтральны саюз украінскага студэнцтва аб'ядноўвае 22 студэнцкія арганізацыі і налічвае прыблізна 6000 членаў. Ведаючы пра прыхільнае стаўленне беларускага студэнцтва да ўкраінскага, мяркуем, што ўмацуем яго і наладзім больш цесныя сувязі з Вашым студэнцтвам" [16, л. 113]. У сваіх лістах да Беларускага студэнцкага саюза ўкраінская моладзь часта падтрымлівала беларусаў, садзейнічала развіццю іх дзейнасці як у Вільні, так і за мяжой.

Цудоўнай ілюстрацыяй асаблівасцей супрацоўніцтва з'яўляецца ліст ад Украінскага акадэмічнага таварыства "Січ" да БСС, датаваны 1922 г.: "Мы атрымалі ад украінскага прэсавага бюро ў Вене Ваш штомесячнік, які прагледзелі з вялікай

зацікаўленасцю. ... Ад аддзялення Украінскага акадэмічнага таварыства "Січ" у Вене запэўніваем, што ўсё украінскае студэнцтва вельмі прыхільна ставіцца да вызвольнага беларускага руху" [15, л. 73]. Кіраўнік таварыства І. Астапчык у лісце звяртаецца з просьбай выслаць у Аўстрыю часопіс "Наш шлях". Штомесячнік "Наш шлях" быў першым друкаваным органам Беларускага студэнцкага саюза, выдаваўся БСС у 1922 г. [13, с. 9].

Ёсць падставы меркаваць, што беларускія студэнты выслалі ў Вену свой часопіс, бо кантакты паміж арганізацыямі пашыраліся і развіваліся. Украінскае акадэмічнае таварыства "Січ" унесла значны ўклад у развіццё дыяспары украінцаў у першай палове XX ст. Нягледзячы на тое, што яно перапыніла сваю дзейнасць у перыяд Першай сусветнай вайны, у міжваенны час таварыства зноў стала папулярным у асяродку украінскай студэнцкай моладзі. Вясной 1922 г., калі ўкраінскія эмігранты звярталіся ў сваім лісце з просьбай і прапановай да беларусаў, у таварыства ўваходзіла больш за 350 чалавек [23, с. 27]. У арганізацыі былі прадстаўнікі розных палітычных партый і перакананняў. Таварыства "Січ" мела сацыялістычны, правы і дэмакратычны кірунак, членамі яго былі такія вядомыя палітычныя дзеячы украінскага замежжа, як А. Мельнік, Ю. Паўлікоўскі, Б. Кудрык, В. Лаба і інш. [23, с. 27].

Беларускіх эмігрантаў украінцы замежжа таксама актыўна запрашалі на свае палітычныя і культурныя мерапрыемствы. Напрыклад, афіцыйным запрашэннем Украінскі рэспубліканскі клуб у Празе заклікаў беларускіх эмігрантаў з АБСА далучыцца да акадэміі, прысвечанай 10-годдзю абвяшчэння самастойнасці Украінскай Народнай Рэспублікі [3, л. 20]. На вечарыне былі прадстаўленыя рэфераты ўкраінскіх прафесараў О. Латоцкага і А. Якаўлева па гісторыі абвяшчэння УНР. Па надпісе на запрашэнні можна зрабіць выснову, што беларуская моладзь наведала дадзенае мерапрыемства і прыняла ў ім актыўны ўдзел.

Украінскія арганізацыі за мяжой мелі значна большы арганізацыйны вопыт. Гісторыя стварэння ўкраінскіх эміграцыйных партый, грамадскіх арганізацый, перыядычных выданняў пачынаецца раней за беларускую гісторыю эміграцыі, бо першыя звесткі пра ўкраінскія аб'яднанні адносяцца да канца XIX стагоддзя. Украінскія эмігранты дзяліліся арганізацыйным вопытам з беларусамі замежжа, пра што можна знайсці інфармацыю на старонках прэсы беларускай дыяспары і ў пратаколах пасяджэнняў беларускіх аб'яднанняў, саюзаў, таварыстваў, партый і суполак. Напрыклад, часопіс "Беларускі студэнт" (№ 1 за 1923 г.) у рубрыцы "Хроніка" апублікаваў матэрыял пра намер беларускіх студэнтаў у Чэхаславакіі арганізаваць таварыства: "Пры арганізацыі вельмі шмат памагае брат Украінец сябра Паньчак, старшыня Саюзу Адраджэньня Украінскага Студэнства" [1, л. 22]. З артыкула можна зрабіць выснову пра ўдзячнасць беларускага студэнцтва членам украінскага саюза.

Арганізацыйную падтрымку беларускай эміграцыі ўкраінцамі замежжа можна праілюстраваць лістамі вядомага беларускага паэта Уладзіміра Жылкі з Варшавы, куды яго накіравалі беларускія студэнты з Прагі ад АБСА на VII кангрэс C.I.E. У сваім лісце ў Прагу ад 15 верасня 1924 г. У. Жылка падрабязна распавядае пра вынікі яго перамоў аб ўключэнні Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый у вольныя члены Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі. Ліст пачынаецца словамі: "Даражэнькія мае! У суботу ў 6 гадзіне прыехаў у Варшаву. У той жа самы вечар пазнаёміўся з тутэйшай украінскай калёніяй. Іх тут чалавек 40–50 – злучаныя ў грамаду. Пазнаёмілі мяне яны з нашымі беларусамі са Стоўбцаў" [2, л. 13]. З аповеду У. Жылкі можна зрабіць выснову, што ўкраінскія дзеячы ў Варшаве дапамагалі беларусам з Прагі падтрымліваць сувязь з

беларускімі студэнцкімі арганізацыямі. Высновы паэта маюць вялікае гістарычнае значэнне, бо ён быў сведкам і актыўным удзельнікам палітычных мерапрыемстваў у Чэхаславакіі. Уладзімір Жылка нелегальна прыехаў у Прагу, дзе вучыўся на філалагічным факультэце Карлавага ўніверсітэта [9, с. 107].

Украінская студэнцкая грамада ў Варшаве, пра якую пісаў У. Жылка, была створана ў 1921 г. з афіцэраў арміі УНР, налічвала ў сваім складзе першапачаткова каля 300 чалавек [32, с. 216]. Праца арганізацыі была разнастайная, аказвалася ўсялякая падтрымка яе членам. Грамада пад кіраўніцтвам яе першага старшыні Т. Алесіюка ўжо з 1921 г. разгарнула шырокую дзейнасць па далучэнні інтэрнаваных вайскоўцаў да ўкраінскага студэнцкага руху [20, с. 8]. Арганізацыя займалася актыўнай выдавецкай дзейнасцю, за час свайго існавання выпусціла некалькі часопісаў, аднак ніводзін з іх не стаў сістэматычным і распаўсюджаным выданнем. Украінская студэнцкая грамада ў Варшаве выдавала часопісы “Студэнцкі веснік” (1921), “На чужыне” (1924), “Студэнцкі голас” (1927–1928) [32, с. 215–216]. Перыядычныя выданні грамады былі грамадска-палітычнымі, на іх старонках асвятляліся найбольш важныя падзеі свету, аналізавалася сітуацыя з украінскай эміграцыяй, перспектывы атрымання вышэйшай адукацыі для моладзі ўкраінскага замежжа.

У лістах У. Жылкі з Варшавы неаднаразова падкрэслівалася падтрымка ўкраінскай студэнцкай арганізацыі ЦЭСУС і Украінскай студэнцкай грамады для прыняцця Аб’яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый у Міжнародную студэнцкую канфедэрацыю. Сам Уладзімір Жылка спыніўся ў Варшаве ў будынку Украінскай студэнцкай грамады, што сведчыць пра сяброўскія адносіны паміж беларусамі і ўкраінцамі.

Для эфектыўнай дзейнасці беларускай эміграцыі ў міжваенны перыяд неабходна было захаваць гістарычную памяць, нацыянальную ідэнтычнасць, этнічную самабытнасць. Дзеля гэтага патрэбна было развіваць навуковыя цэнтры, ствараць беларускія школы і клубы. Найбольш актыўна праявіла сябе беларуская моладзь у Чэхаславакіі. Беларускіх публічных бібліятэк за мяжой не існавала, таму беларускія студэнты і прадстаўнікі беларускай эміграцыі часта выкарыстоўвалі кнігі ўкраінскіх бібліятэк. Сярод найбольш вядомых украінскіх бібліятэк Чэхаславакіі можна назваць наступныя: бібліятэка-выпазычальня Украінскага грамадскага выдавецкага фонда, бібліятэка-выпазычальня пры Украінскай кніжнай краме Ф. Свабоды, бібліятэка Украінскага вольнага ўніверсітэта [11, с. 281]. Акрамя таго, супрацоўніцтва беларускіх і ўкраінскіх студэнтаў было і на побытавым узроўні, бо беларусы жылі ва ўкраінскіх інтэрнатах для студэнтаў, наведвалі ўкраінскую сталоўку ў Празе, удзельнічалі ў дзейнасці “Украінскай хаты”. Украінская сталоўка ў Празе была створана па ініцыятыве Украінскага жаночага саюза ў Чэхіі ў 1933 г. [17, с. 14]. Вельмі хутка сталоўка ператварылася ў культурны цэнтр украінскай дыяспары ў Празе, там праводзілі канцэрты, ладзілі выставы і літаратурныя вечарыны.

Важным фактарам, які садзейнічаў асабістым кантактам беларускай і ўкраінскай моладзі замежжа стала падабенства пеўчай і фальклорнай традыцыі, блізкасць матэрыяльнай культуры. Украінцы за мяжой свае нацыянальныя традыцыі старанна захоўвалі ў асаблівасцях народных страў, песнях і танцах, традыцыі бавіць вольны час і г. д., а беларускія юнакі і дзяўчаты далучаліся да іх. Некаторыя беларусы ўдзельнічалі ў рабоце студэнцкіх украінскіх гурткоў, разам спявалі і адзначалі народныя святы.

**Заключэнне**

Студэнцтва было адной з найбольш дынамічных частак беларускай і ўкраінскай дыяспары, дастаткова адкрытае для супрацоўніцтва з іншымі нацыямі. Беларускія і ўкраінскія студэнцкія арганізацыі цесна супрацоўнічалі за мяжой, асабліва яскрава агульныя кантакты праявіліся ў Чэхаславакіі. Формы ўзаемасувязей беларускай і ўкраінскай эміграцыі былі розныя, аднак дастаткова часта яны адрозніваліся пазітыўным стаўленнем і ўзаемадапамогай. У міжваеннай Чэхаславакіі беларусы мелі магчымасць атрымліваць адукацыю ва ўкраінскіх вышэйшых навучальных установах, удзельнічаць у рабоце ўкраінскіх хораў, гурткоў, таварыстваў. Украінскія эмігранты аказвалі беларускай моладзі як маральную, так і матэрыяльную падтрымку. Важнай для ўсёй беларускай дыяспары была арганізацыйная дапамога ўкраінскай супольнасці за мяжой. Прадстаўнікі ўкраінскай эміграцыі прымалі актыўны ўдзел у беларускіх палітычных мерапрыемствах, культурных сустрэчах, самі запрашалі беларусаў на свае вечарыны. На міжнародным узроўні ўкраінскае студэнцтва было асноўным саюзнікам у барацьбе за правы беларускай моладзі.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 49. “Беларускі студэнт” часопіс № 1 за 1920 г. і № 7 за [1924 г.], г. Прага, гектаграфічнае выданне.
2. БДАМЛМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 184. Перапіска Аб’яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый у г. Прага з установамі па арганізацыйных пытаннях, распіскі за 1924–1927 гг.
3. БДАМЛМ. – Фонд. 3. – Воп. 1. – Спр. 185. Перапіска Аб’яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый Заходняй Беларусі і эміграцыі ў г. Прага з установамі па арганізацыйных пытаннях, распіскі за 1927–1928 гг. Т. 2.
4. БДАМЛМ. – Фонд. 3. – Воп. 1. – Спр. 186. План работы аддзела міжнародных адносін аб’яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый Заходняй Беларусі і эміграцыі ў г. Прага на 1926 г. Чарнавік. Справаздачы аддзела за 1927 г.
5. БДАМЛМ. – Фонд. 3. – Воп. 1. – Спр. 187. Дакументы фінансавай справаздачы Аб’яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый Заходняй Беларусі і эміграцыі ў г. Прага за 1924 г.
6. БДАМЛМ. – Фонд. 3. – Воп. 1. – Спр. 188. Сшытак рэгістрацыі ўваходных і выходзячых дакументаў Аб’яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый Заходняй Беларусі і эміграцыі ў г. Прага за 1924–1927 гг.
7. БДАМЛМ. – Фонд. 3. – Воп. 1. – Спр. 308. Бюлетэні ўкраінскага прэс-бюро ў Чэхаславакіі (г. Прага) за 1924–1925 гг. на ўкраінскай мове.
8. Головенько, В. Молодіжний рух української діаспори / В. Головенько // Українська діаспора. – Число 6. – Київ : Інтел, 1994. – С. 70–78.
9. Жук-Грышкевіч, Р. Жыцьцё Вінцэнта Жук-Грышкевіча / Р. Жук-Грышкевіч. – Таронта : Выдавецкі Фонд Успамінаў зь Беларускага Жыцьця, 1993. – 797 с.
10. Зубко, О. Громадсько-культурна діяльність білоруської та української діаспор у Чехо-Словаччині в 1921–1939 рр. / О. Зубко // Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя : матэрыялы IV Міжнар. кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў кантэсце культур еўрапейскіх краін”, Мінск, 6–9 чэрвеня 2005 г. / пад рэд. А. Мальдзіса, А. Смаленчука. – Мінск : Рэд. газ. “Голас Радзімы”, 2006. – С. 67–73.

11. Капривова, А. Русская, украинская и белорусская эмиграция в Праге / А. Капривова. – Прага : [б. и.], 1999. – 26 с.

12. Ляхоўскі, У. Грамадска-культурная чыннасць беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг. / У. Ляхоўскі // Общественно-культурная жизнь белорусской и российской эмиграции в Чехословакии 1921–1938. Каталог выставки в Нац. музее истории и культуры Беларуси с 27 мая по 3 июля 2002 г. – Минск : Новопринт, 2002. – С. 21–31.

13. Мастыка, А. Беларускі студэнцкі саюз універсітэту Стэфана Баторыя (1921–1939) / А. Мастыка // Biuletyń Historii Pogranicza. – Białystok, 2009. – № 10. – S. 5–19.

14. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд. 459. – Воп. 1. – Спр. 5. Артыкулы, аўтограф, рукапісы.

15. НАРБ. – Фонд. 884. – Воп. 1. – Спр. 1. Перапіска са студэнцкімі і іншымі арганізацыямі.

16. НАРБ. – Фонд. 884. – Воп. 1. – Спр. 3. Рэзалюцыя Пазачарговага з'езда Цэнтральнага саюза ўкраінскага студэнцтва ў Данцынгу, ліставанне з беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры.

17. Пеленська, О. Український портрет на тлі Праги. Українське мистецьке середовище в міжвоєнній Чехо-Словаччині / О. Пеленська. – Нью-Йорк ; Прага : Науково Товариства ім.. Шевченка в Америці, 2005. – 221 с.

18. Перавясла. – Прага. – 1923. – № 1. – 64 с.

19. Прамень. – Прага.. – 1926. – № 1. – 34 с.

20. Роговий, В.М. Матеріальна підтримка українського студентства на чужині в 1920–1991 роках : автореф. дис. … доктор. історич. наук : 07.00.01 / В. М. Роговий. – Київ : 2009. – 32 с.

21. Русская, украинская и белорусская эмиграция в Праге. Каталог выставки. – Прага : Národní knihovna České republiky, 1995. – 53 с.

22. Рэха. – Парыж. – 1938. – № 2. – 20 с.

23. Трощинський, В.П. Міжвоєнна українська еміграція в Європі як історичне і соціально-політичне явище / В.П. Трощинський. – Київ : Ітел, 1994. – 260 с.

24. Чмарава, М. Шляхі ўзаемнага пазнання: беларуская літаратура ў Чэхаславакіі (1920–1945) / М. Чмарава. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2004. – 136 с.

25. Цэнтральны дзяржаўны архіў вышэйшых органаў улады і кіравання Украіны (ЦДАВО). – Фонд 3859. – Воп. 1. – Спр. 179. Заявы, пасведчанні пра нараджэнне і адукацыю, пасведчанні экзаменаў і іншыя асабістыя дакументы, якія неабходна вярнуць уласнікам.

26. ЦДАВО – Фонд 3905. – Воп. 2. – Спр. 63. Спіс украінскіх студэнцкіх арганізацый ЦЕСУС.

27. ЦДАВО – Фонд 3920. – Воп. 1. – Спр. 1. Статут Камітэта.

28. ЦДАВО – Фонд 3920. – Воп. 1. – Спр. 2. Копія пратакола пасяджэння Чэска-ўкраінскага камітэта дапамогі студэнтам украінцам у г. Прага.

29. ЦДАВО – Фонд 3920. – Воп. 1. – Спр. 8. Заявы ўкраінскіх і беларускіх студэнтаў, якія навучаюцца ў вышэйшых школах Чэхаславакіі, на грашовую дапамогу і адтэрміноўку здачы іспытаў.

30. ЦДАВО – Фонд 3920. – Воп. 1. – Спр. 10 а. Кніга выдачы прадуктаў студэнтам.

31. ЦДАВО Фонд 3920. – Воп. 1. – Спр. 43. Паведамленні пра паспяховае навучанне ўкраінскіх і беларускіх студэнтаў, якія вучацца ў розных вышэйшых школах Чэхаславацкай Рэспублікі. З літараў "Б – Г" (ёсць біяграфічныя дадзеныя і фотаздымкі).

32. Wiszka, E. Prasa emigracji ukraińskiej w Polsce 1920–1939 / E. Wiszka. – Toruń : Wydawnictwo Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2001. – 324 s.

***Koval V.U.* The ties Between Belarusian and Ukrainian Students' Organizations in Czechoslovakia (1918–1939)**

The article gives the analysis of the place and role of Belarusian and Ukrainian students' organizations between the Word Wars. The subject of this survey is the political and cultural ties between Belarusian and Ukrainian students in Czechoslovakia. The topic of Belarusian emigration in the inter-war period has not sufficiently explored but it is relevant and important. The article resumes that the most active political, cultural and education contacts were between Belarusians and Ukrainians in Czechoslovakia from 1918 till 1939. The author uses new publications of Belarusian scientists and little-known in Belarus materials of foreign archives.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 27.08.2010